**Дзяржпадтрымка.** Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне, якім зацверджана рашэнне савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Прадугледжваецца, што за кошт сродкаў фонду будзе аказана падтрымка на суму больш як Br 1,6 млн для рэалізацыі творчых праектаў. Частка сродкаў будзе накіравана на правядзенне рэстаўрацыйных і аднаўленчых работ на чатырох аб'ектах са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці. Гэта сядзібна-паркавыя ансамблі ў вёсцы Закозель Драгічынскага раёна і аграгарадку Залессе Смаргонскага раёна, помнік архітэктуры XIX ст., што рэстаўрыруецца пад краязнаўчы музей, у Лепелі і замак у аграгарадку Гальшаны Ашмянскага раёна. Акрамя таго, грашовыя сродкі выдзеляць на папаўненне фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі комплексам рукапісных і друкаваных кніжных помнікаў.